# Да таямніц навакольнага свету

**Гомельскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя праводзіць сістэмную праф- арыентацыйную работу са старшакласнікамі. Падобныя мерапрыемствы плануецца ўкараняць ва ўсіх навучалыііых установах рэгіёна. Аб эколага-асветніцкай дзейнасці і актуальных задачах, якія стаяць перад эколагамі вобласці, расказаў старшыня камітэта Павел НОВІКАУ.**

**У госці да эколагаў анлайн**

Дзейнасць камітэта ахоплівае практычна ўсе сферы жыцця чалавека. Экалагічнае ведамства вобласці - цэнтр прыцягнення неабыякавых людзей, якія клапоцяцца аб навакольным асяроддзі. На практыцы дзейнасць эколагаў Гомельшчыны - дзясяткі прыродаахоўных акцый, дзён азелянення і іншыя мерапрыемствы.

Дарэчы, даведацца больш падрабязна аб працоўных буднях спецыялістаў камітэта можна ў сацыяльных сетках, якія сёння развівае ведамства. Апошнія два гады актыўна напаўняецца сайт эколагаў Гомельшчыны, які карыстаецца папулярнасцю ў жыхароў рэгіёна.

Размяшчаем яркія прыклады, як трэба па- ступаць у адносінах да прыроды, публікуем заканадаўчыя нормы, інфармацьно аб экалагічных акцыях, важных для эколагаў датах, - тлумачыць Павел Новікаў. - Адзін са значных напрамкаў дзейнасці камітэта - экалагічная асвета. У гэтым плане ў прыярытэце сістэмная работа з жыхарамі рэгіёна ўсіх узростаў. Так, шэраг экапраектаў знайшлі актыўны водгук у людзей.

**Эказаняткі**

- У рэгіёне ў кожным раённым цэнтры дзейнічаюць «зялёныя школы». У мінулым годзе паставілі задачу - пашырыць гэтую работу, ахапіць мерапрыемствамі экалагічнай скіраванасці ўсе навучальныя ўстановы вобласці, - адзначыў Павел Уладзіміравіч.

Быў сфарміраваны план-графік, узгоднены з Галоўным упраўленнем адукацыі аблвыканкама. Падышлі да пытання творча. Падрыхтавалі мультыплікацыйныя матэрыялы на розныя прыродаахоўныя тэмы: як паводзіць сябе на прыродзе, як сартаваць і абыходзіцца з адходамі, як даглядаць зялёныя насаджэнні. Такія мерапрыемствы таксама дапаўняюцца невялікімі, зразумелымі і цікавымі лекцыямі для дзяцей.

Асобны акцэнт - на інфармацыю, што характарызуе мясцовасць, дзе жывуць удзельнікі экалагічных заняткаў. Напрыклад, якія асаблівыя ахоўныяпрыродныя тэрыторыі (ААПТ) у іх раёне, якія існуюць віды чырванакніжных жывёл, птушак, раслін. Сёлета зрабілі два новыя ролікі аб пажарах у экасістэмах і абыходжанні з адходамі. У такім фармаце дзецям і падлеткам болын цікава знаёміцца з важнымі экалагічнымі тэмамі, - перакананы старшыня Гомельскага абласного камітэта ПРіАНА.

**Аб прафесіі**

На наступны год эколагі рэгіёна плануюць падрыхтаваць фільм, дзе будзе цалкам адлюстравана работа супрацоўнікаў ведамства. Асноўная мэтавая катэгорыя такога фармату прафарыентацыйнай работы - вучні VIII—IX класаў, якія выбіраюць профіль навучання ў школах.

Плануем паказаць увесь ланцужок прафесійнага станаўлення - ад навучання да прыходу на працу маладога спецыяліста. Будзе прадэманстравана і адмысловае абсталяванне для работы (маторныя лодкі, спецмашыны), спецадзенне, - дадаў Павел Новікаў.

Сёння на Гомелынчыне вядучая ўстанова па падрыхтоўцы спецыялістаў-эколагаў - Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. 3 ВНУ падпісана дарожная карта далейшага развіцця прыродаахоўнай дзейнасці ў рэгіёне: распрацаваны сумесныя мера- прыемствы, праграма практыкі, правядзенне дзён адкрытых дзвярэй.

**І па вадзе, і пешшу**

Між тым сёння вельмі важную ролю адыгрывае Гомельскі абласны камітэт ПРіАНА ў развіцці экатурызму.

На тэрыторыі вобласці - 126 ААПТ. Створаны тры перспектыўныя дзяржаўныя прыродаахоўныя ўстановы: заказнікі «Выдрыца» ў Светлагорскім раёне, «Смычок» на Жлобіншчыне, «Днепра-Сожскі» ў Лоеўскім раёне, - патлумачыў Павел Уладзіміравіч.

У сувязі з абстаноўкай на мяжы з Украінай турыстычная дзейнасць заказніка ў міжрэччы Дняпра і Сожа пакуль што не развіваецца так шырока. Затое актыўна «прырастае» гэты кірунак у «Выдрыцы» і «Смычку».

Паток турыстаў у рэгіёне даволі вялікі. Штогод прымаем на тэрыторыі нашых трох заказнікаў каля 4000 чалавек. Галоўная задача - не толькі размясціць людзей, але і аказаць ім турыстычныя паслуг!, - зазначыў старшыня камітэта. - Летась мы закупілі для «Выдрыцы» каякі, а сёлета - байдаркі беларускай вытворчасці, каб мець магчымасць арганізоўваць сплавы. Гэты кірунак турызму карыстаецца асаблівай папулярнасцю. Таму распрацаваныя водныя маршруты рознай працягласці і розных узроўняў складанасці, як для спартсменаў, так і для сем'яў з дзецьмі.

Развіваюцца на тэрыторыі дзяржаўных прырода- ахоўных устаноў Гомельшчыны і пешыя экамарш- руты. Толькі ў «Выдрыцы» для турыстаў ёсць магчымасць пераадолець да шасці маршрутаў рознай накіраванасці.

Асаблівасць нрыродаахоўнай тэрыторыі ў Свет- лагорскім раёне ў тым, што ў цэнтры размешчаны мемарыяльны комплекс Ала. У свой час з вучонымі быў абследаваны гэты заказнік, прынята рашэнне вылучыць анклаў са складу ААПТ. Але сёння туры- стам - удзельнікам экамаршрутаў - абавязкова рас- казваюць аб мемарыяльным комплексе. І гэтае мес- ца вельмі папулярнае ў гасцей Гомельшчыны. Таму ў перспектыве плануецца зрабіць тут экалагічную сцежку, у тым ліку з экспазіцыямі для дзяцей, каб паказаць прыгожыя прыродныя мясціны, - падкрэсліў Павел Новікаў.

Створаць на тэрыторыі заказніка і водны маршрут. Мясцовая рэчка Ала (з каналамі і затокамі) - прываб- ная для аматараў сплаваў. Разглядаецца пытанне аб уключэнні ў экамаршрут лясной заімкі - былога кар- дона лесніка ў 7 км ад Алы. Яшчэ адзін перспектыўны накірунак - велападарожжы. У гэтым годзе для заказніка ўжо набыты веласіпеды, бо на такую паслу- гу вялікі попыт.

Каб вывесці развіццё зялёных маршрутаў на Гомельшчыне на болып высокі ўзровень, вырашылі ўзяць на ўзбраенне досвед навукі. У 2023 годзе прыцягнулі навуковыя арганізацыі для распрацоўкі стратэгіі развіцця турызму на тэрыторыях «Смычок» і «Выдрыца». Сёлета гэтую работу правялі і ў Днепра-Сожскім заказніку. Так, спецыялісты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны далі свае рэкамендацыі, на што звярнуць асаблівую ўвагу падчас распрацоўкі зялёных маршрутаў. Гэта, напрыклад, і дадатковыя інфармацыйныя стэнды, і фотазоны. Узаемадзеянне з навукоўцамі для развіцця тэрыторыі працягнецца і ў далейшым, - рэзюмаваў старшыня Гомельскага абласнога камітэта ПРіАНА.

**Натталля КАПРЫЛЕНКА**